Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР






# НАЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

# НАЗАЎСЁДЫ РАЗАМ

**Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР**

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1999

*Аляксандр Вабішчэвіч*

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ШКОЛА: СКЛАДАНАСЦІ РАЗВІЦЦЯ (1921—1939 гг.)

З самага пачатку польскай акупацыі Беларусі ў 1919 г. беларускія школы, якія дзейнічалі з 1915 г., гвалтоўна закрываліся. У Віленскай акрузе са 153 беларускіх школ засталося ў пачатку 1920 г. толькі 17 легальных і каля 40 тайных. Прычына такога стаўлення польскіх улад да беларускіх школ заключалася ў непрызнанні самастойнасці беларускага нацыянальнага руху наогул. Яго лічылі штучным утварэннем нямецкіх акупацыйных улад для супрацьвагі польскаму і расійскаму ўплывам. Аднак прычыны такой з'явы былі больш глыбінныя: у росце нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Менавіта гэтым і тлумачыцца той факт, што на ўсіх этнічных беларускіх землях у 1920-я гады, нягледзячы на падзел іх межамі розных дзяржаў, ажывіўся рух за нацыянальную школу. Адносіны польскіх улад да беларускай школы істотна не змяніліся і пасля 1921 г. У Навагрудскім ваяводстве закрыццё беларускіх школ было прадугледжана спецыяльным цыркулярам ваяводы ад 18 верасня 1921 г. Забаранялася вывучаць беларускую мову ў школах не толькі як асноўны, але і як дадатковы прадмет. Такая сітуацыя назіралася і ў іншых заходнебеларускіх ваяводствах. Гэта супярэчыла канстытуцыі Польшчы, Рыжскаму мірнаму дагавору 1921 г. (артыкул 7 гарантаваў нацыянальным меншасцям іх правы ў карыстанні роднай мовай, арганізацыі ўласных школ і развіцці сваёй культуры) і Версальскаму трактату (артыкулы 8 і 9 забяспечвалі свабоду нацыянальным меншасцям, іх правы ў галіне адукацыі). З 514 беларускіх школ, што існавалі ў 1919/20 навучальным годзе на тэрыторыі, якая адышла да Польшчы ў 1921 г., да 1922/23 навучальнага года засталося толькі 32.

Да сярэдзіны 1924 г. не было пэўных юрыдычных падстаў для далейшага развіцця беларускіх школ у Заходняй Беларусі. Хаця закон ад 17 лютага 1922 г. прадугледжваў навукова-метадычную дапамогу, забеспячэнне бібліятэк падручнікамі і вучэбнай літаратурай з боку польскай дзяржавы, аднак усё гэта атрымлівалі школы з польскай мовай навучання. Артыкул 18 згаданага закона сцвярджаў, што адкрыццё і ўтрыманне няпольскіх пачатковых школ павінен рэгламентаваць асобны закон. Гэта дазваляла ўладам пашыраць у Заходняй Беларусі колькасць польскіх школ пры адначасовай ліквідацыі беларускіх. У адносінах да беларускіх навучальных устаноў пераважалі паліцэйска-адміністрацыйныя меры. Адукацыйная сістэма ператваралася ў дзейсны фактар паланізацыі. Выкананне гэтай задачы аблягчалася фактычнай адсутнасцю беларускай інтэлігенцыі. Згодна з польскімі крыніцамі, сярэднюю і вышэйшую адукацыю мелі адпаведна 0,27 і 0,17% заходнебеларускага насельніцтва. Палітыка паланізацыі і ліквідацыі нацыянальнай школы адразу ж сутыкнулася з супрацьдзеяннем з боку беларусаў. Першапачаткова гэта ажыццяўлялася на парламенцкай аснове. Ужо на пачатку свайго існавання, 14 снежня 1922 г., беларускі пасольскі клуб «Змаганне» накіраваў ураду Польшчы запыты (інтэрпеляцыі) наконт уціску ў галіне адукацыі. Беларускія паслы дамагаліся ліквідацыі перашкод пры адкрыцці прыватных нацыянальных пачатковых і сярэдніх школ, утрымання дзяржавай беларускіх пачатковых школ з колькасцю вучняў звыш 40, вяртання настаўнікаў пасля заканчэння імі курсаў у Кракаве назад у заходнебеларускія школы, хуткага адказу

(на працягу аднаго тыдня) школьнага інспектара адносна дазволу на адкрыццё беларускай школы, заснавання беларускай настаўніцкай семінарыі, субсідзіравання беларускіх гімназій нароўні з польскімі. У час сустрэчы з міністрам Тугутам Б. Тарашкевіч патрабаваў стварыць замест школьных куратарыяў у Навагрудку і Вільні адну акругу, дзе пасаду намесніка куратара павінен заняць беларус, неадкладна адкрыць адну дзяржаўную сярэднюю і 100 беларускіх пачатковых школ, а таксама 2 настаўніцкія семінарыі. Гэта быў мінімум патрабаванняў да польскага ўрада ўзамен на лаяльныя адносіны да яго. У ходзе далейшай палітычнай палярызацыі і радыкалізацыі корпуса беларускіх паслоў крытыка ўлад узмацнілася. Найбольш вострымі былі выступленні Б. Тарашкевіча, А. Станкевіча, В. Рагулі, Ф. Ярэміча.

Па ініцыятыве паслоў, якія ўваходзілі ў склад кіраўніцтва Таварыства беларускай школы у многіх мясцовасцях праводзіўся байкот польскіх школ. Гэтая акцыя адбывалася ў час разгортвання партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. У Пінскім павеце Палескага ваяводства ў польскія школы пайшло толькі 5—7% дзяцей школьнага ўзросту. Наогул, на Палессі беларускае насельніцтва негатыўна ставілася да польскіх школ: адмаўлялася дастаўляць паліва, рамантаваць школьныя будынкі, прадаваць прадукты харчавання настаўнікам.

Важнае значэнне ў палітыцы паланізацыі адукацыі акрамя закрыцця беларускіх школ мелі кадравыя і фінансавыя пытанні. Для адпаведнага вырашэння кадравага пытання выкарыстоўваліся наступныя меры: беларускія настаўнікі перасяляліся ў цэнтральныя і заходнія ваяводствы Польшчы, іх пасады займалі выхадцы з захаду краіны, педагагічныя калектывы па нацыянальнай структуры станавіліся пераважна польскімі. На настаўніцкіх курсах у Кракаве ў 1921/22 навучальным годзе было перападрыхтавана 250 беларускіх настаўнікаў (большасць іх скончыла беларускія курсы ў Вільні), у 1925/26 г. — 100, у 1927/28 г. — 40 настаўнікаў. Пасля заканчэння курсаў перападрыхтоўкі яны накіроўваліся на працу за межы Заходняй Беларусі. Ва ўмовах скарачэння колькасці беларускіх школ сярод беларускіх настаўнікаў расло беспрацоўе — толькі ў 1925 г. такіх было зарэгістравана 640 чалавек. І гэта ў той час, калі ў польскіх школах у Заходняй Беларусі не хапала настаўніцкіх кадраў. У снежні 1925 г. на Віленшчыне 324 настаўнікі працавалі там, дзе яны нарадзіліся, а 441 з'яўляўся выхадцам з цэнтральных рэгіёнаў Польшчы. У Навагрудскім і Палескім ваяводствах гэтыя суадносіны былі адпаведна 241 і 568, 110 і 420 настаўнікаў. Колькасць палякаў у настаўніцкім корпусе станавілася дамінуючай. У Віленскім ваяводстве з 2049 настаўнікаў палякаў было 1933, беларусаў — 60, на Навагрудчыне і Палессі — адпаведна 1660 і 78, 1150 і 54 чалавекі. Павелічэнне колькасці настаўнікаў-палякаў было састаўной часткай каланізацыйнай палітыкі польскай дзяржавы, якая мела на мэце канчаткова пераўтварыць Заходнюю Беларусь у «крэсы». Такая кадравая палітыка ў галіне адукацыі мела доўгатэрміновую арыентацыю, бо большасць перасяленцаў мела ўзрост 20 — 29 гадоў.

Нацыянальная палітыка Польшчы выклікала неадабрэнне ў палітычных колах некаторых еўрапейскіх краін. Пэўную ролю па інфармаванні еўрапейскіх палітыкаў аб культурна-нацыянальным становішчы няпольскіх народаў адыграў створаны ў пачатку 1924 г. у Парыжы Камітэт паняволеных Польшчай нацый. Сябар Камітэта былы кіраўнік урада Беларускай Народнай Рэспублікі В. Ластоўскі яшчэ ў верасні 1923 г. ў спецыяльна падрыхтаваным для Лігі Нацый мемарандуме акцэнтаваў увагу на пе-

рашкодах, якія чыніліся беларусам польскімі ўладамі ў галіне адукацыі, культуры, рэлігіі.

Гэта прымусіла польскі ўрад пайсці на некаторыя ўступкі. 31 ліпеня 1924 г. сейм прыняў «Закон аб мове і арганізацыі школьнай справы для нацыянальных меншасцей». Хаця артыкулам 1 гарантавалася раўнапраўе нацыянальнасцей, праблема вырашалася ў духу асіміляцыі. Так, згодна з законам, беларуская дзяржаўная школа магла быць адкрыта ў тых паветах, дзе беларусы складалі 25% насельніцтва, і ў тым выпадку, калі гэтага патрабавалі не менш як 40 бацькоў дзяцей школьнага ўзросту. Каб адкрыць беларускую школу, трэба было падаць школьнаму інспектару дэкларацыі з подпісамі, якія папярэдне зацвярджаліся ў гміне старастам і натарыусам. Дзеянне закона распаўсюджвалася на Навагрудскае, Віленскае, Палескае ваяводствы і 2 паветы Беластоцкага — Гродзенскі і Ваўкавыскі. Значная частка беларускага насельніцтва Беласточчыны засталася наогул па-за ўвагай закона. Замацоўваў закон і няроўнасць беларускай і польскай школ. Калі для адкрыцця беларускай школы патрабавалася 40 подпісаў, то пры наяўнасці 20 подпісаў за навучанне на польскай мове адкрывалася утраквістычная (двухмоўная, польска-беларуская) школа. Гэта значна ўскладняла рэалізацыю гарантаванага артыкулам 1 закона раўнапраўя нацыянальнасцей у школьным пытанні.

Закон яшчэ да яго прыняцця востра крытыкаваўся беларускімі пасламі. 9 ліпеня 1924 г. Б. Тарашкевіч у сваёй прамове ў сейме падкрэсліваў, што закон прымаўся дзеля заспакаення еўрапейскай грамадскасці. Паводле слоў пасла, закон не даваў рэальнай магчымасці для далейшага развіцця беларускай школы, бо ў двухмоўнай школе «навучанне адбываецца на польскай мове, а беларускія гадзіны — гэта гімнастыка, маляванне, рухомыя гульні». 1 кастрычніка 1924 г. Беларускі пасольскі клуб дамагаўся ад сейма ліквідацыі перашкод пры адкрыцці беларускіх школ. Гэтае патрабаванне разам з шэрагам іншых было прадстаўлена яго дэлегацыяй ураду. Аднак рэальных зрухаў да лепшага ў стане беларускай школы не было. Двухмоўныя школы былі даволі выгаднымі для польскіх улад, бо дазвалялі польскім уладам кантраляваць іх, абмяжоўваць развіццё руху за школы на роднай мове. «Утраквізм — ...толькі шкодная спроба паланізацыі. Шкодная таму, што прымушае вучыцца на няроднай мове». Асабліва гэта адчувалі беларусы, якія з'яўляліся пераважна сялянамі. Нізкі ўзровень іх матэрыяльнай забяспечанасці не даваў магчымасці для шырокага развіцця прыватнай адукацыі і прымушаў вучыцца ў двухмоўных ці польскіх школах.

Аналіз стану прыватных беларускіх школ у Польшчы паказвае, што яны сутыкаліся з цяжкасцямі, якія наўмысна ствараліся ўладамі. «Неабходна адукацыю трымаць у руках дзяржавы і не дапускаць занадта моцнага развіцця прыватных школ. ...Найлепшы тып школ, прызначаны для чужамоўных дзяцей — утраквістычныя». Аб мэтанакіраванай палітыцы абмежавання росту прыватных школ і мерах па яе ажыццяўленні яскрава сведчыць выказванне куратара Палескай школьнай акругі З. Гансяроўскага: «У галіне сярэдняй адукацыі стрымліваць... празмернае развіццё колькасці прыватных школ шляхам пастаноўкі кожны раз вышэйшых педагагічных і фінансавых патрабаванняў пры выдачы канцэсіі». Неабгрунтавана завышаныя патрабаванні, незацвярджэнне настаўнікаў і г.д. былі тыповай з'явай і ў адносінах да беларускіх пачатковых школ. Некаторыя прадстаўнікі польскай адміністрацыі прапаноўвалі выбраць больш хуткі спосаб ліквідацыі беларускай адукацыі. Навагрудскі ваявода З. Бячковіч

лічыў, што «трэба імкнуцца да саперніцтва лепшай польскай школы з горшай беларускай і так дабівацца павольнага знікнення апошняй». Вядома, ва ўмовах абвастрэння сацыяльнай і нацыянальнай напружанасці ў Заходняй Беларусі ў 1920-я гады хутка ажыццявіць гэты план было немагчыма. Таму польская адміністрацыя імкнулася прадставіць рух за беларускую школу як частку падрыўной камуністычнай дзейнасці. Так, на нарадзе кіраўнікоў усходніх ваяводстваў у Міністэрстве ўнутраных спраў 19 — 20 кастрычніка 1925 г. прэм'ер-міністр Польшчы С. Грабскі заявіў: «Існаванне беларускіх школ ёсць выключэнне, нават і ў сувязі з вынікамі апытання». Ім жа была дадзена ўстаноўка — беларускія пачатковыя школы і гімназіі трэба ліквідаваць.

Таварыства беларускай школы (ТБШ) арганізавала масавую падачу насельніцтвам заяў аб адкрыцці беларускіх школ. У 1924 — 1925 гг. было пададзена каля 16 тыс. дэкларацый на адкрыццё 412 школ. ТБШ стала масавай культурна-асветніцкай арганізацыяй — у сярэдзіне 1928 г. яно налічвала каля 14 — 15 тыс. сяброў. Кампанію па зборы подпісаў за адкрыццё беларускіх школ праводзіла і Тымчасовая беларуская рада, якая ўтварылася ў 1924 г. Аднак гэтае паланафільскае аб'яднанне імкнулася звязаць вырашэнне праблемы з лаяльнымі адносінамі да польскіх улад. У пададзеным 9 чэрвеня 1926 г. ураду Польшчы мемарыяле яго дзеячы патрабавалі адкрыцця каля 500 беларускіх пачатковых школ, расшырэння існуючых курсаў у Вільні для падрыхтоўкі настаўнікаў, выдачы ўсім слухачам-беларусам курсаў у Кракаве і Вільні кваліфікацыйных пасведчанняў і забеспячэння іх працай у Заходняй Беларусі, заснавання новых беларускіх гімназій у Гродне, Пінску і іншых гарадах, выдзялення субсідый Навагрудскай і Клецкай сярэднім школам, адкрыцця кафедры беларусазнаўства ў Віленскім універсітэце. Таварыства «Прасвета» павінна было падабраць адпаведныя кадры, а ўлады зацвердзіць у залежнасці ад ступені іх палітычнай надзейнасці. Такая пазіцыя паланафільскага аб'яднання грунтавалася на пэўным спадзяванні, што «санацыйны» ўрад карэнным чынам зменіць сваё стаўленне да патрабаванняў беларусаў. Аднак надзеі не спраўдзіліся.

Вялікі станоўчы ўплыў на нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі і, у прыватнасці, на рух за беларускую школу зрабілі дасягненні ў развіцці эканомікі, сацыяльнай сферы, культуры ў БССР у 1920-я гады. Там паспяхова ажыццяўлялася палітыка беларусізацыі, асабліва ў галіне адукацыі. Да 1932 г. з агульнай колькасці школ беларускіх было 90%. Спрыяльныя ўмовы ствараліся і для іншых нацыянальных груп насельніцтва. У 1932 г. працавалі польскія (3,6%), яўрэйскія (3%), рускія (1,4%), 17 латышскіх, 12 літоўскіх, 11 нямецкіх, 1 эстонская і 64 змешаныя школы.

У 1920-я гады падтрымку беларускім школам таксама аказвалі ўлады Латвіі, большасць гэтых школ знаходзілася на этнічных землях беларусаў, а менавіта ў Дзвінскім краі. Ужо ў 1922/23 навучальным годзе там дзейнічала 50 школ. Працавалі таксама Дзвінская і Рыжская беларускія гімназіі, настаўніцкія курсы, існавалі Таварыства беларускіх настаўнікаў, Беларускі аддзел пры Міністэрстве асветы Латвіі. Ажыўленне культурна-нацыянальнага жыцця беларусаў, асабліва ў БССР, першыя крокі да аб'яднання іх этнічных зямель (пашырэнне тэрыторыі рэспублікі ў 1924 і 1926 гг.) рабілі моцны ўплыў на актывізацыю нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Майскі (1926) дзяржаўны пераварот у Польшчы не апраўдаў спадзяванняў некаторых прадстаўнікоў заходнебеларускага руху на

пэўныя зрухі ў вырашэнні праблем беларускай школы. Ужо 18 жніўня 1926 г. на пасяджэнні ўрада была прынята праграма адносін да нацыянальных меншасцяў у Польшчы. Галоўнай мэтай польскай нацыянальнай палітыкі ставілася дзяржаўная асіміляцыя меншасцяў. Польская мова павінна была стаць пануючай ва ўсіх дзяржаўных установах, органах самакіравання, школах. Адносна перспектывы нацыянальнай школы беларусаў кіраўнік польскай дзяржавы Ю. Пілсудскі выказаўся так: «...іх мова такая цяжкая і нераспрацаваная, што не можа быць мовай школы і ўстаноў». Самай зневажальнай была ацэнка беларускай інтэлігенцыі: «...нешматлікая, яе маральная і інтэлектуальная вартасць вельмі нізкая». Менавіта такая пазіцыя польскіх урадавых колаў і перашкаджала знайсці паразуменне з беларускімі дзеячамі, у тым ліку і паланафільскай арыентацыі. Такое стаўленне да беларусаў у час найвышэйшага развіцця іх масавага руху, які ўзначальвала Беларуская сялянска-работніцкая грамада, ужо адназначна прадугледжвала меры па знішчэнні яго. Аднак зазначым, што ў адрозненне ад польскіх урадаў 1919 — 1926 гг. палітыка «санацыйных» улад была больш гнуткай у адносінах да беларускага руху. Каб узмацніць раскол сярод беларускай інтэлігенцыі і не дапусціць пашырэння руху за беларускую школу, «санацыйныя» ўлады зрабілі некаторыя ўступкі. Так, Навагрудская беларуская гімназія атрымала права публічнасці, фінансавую дапамогу на будаўніцтва школьнага будынка. Беларуская мова стала вучэбным прадметам у Віленскай духоўнай семінарыі. Было праведзена некалькі канферэнцый, прысвечаных праграмам беларускіх школ і падручнікам. У кастрычніку 1928 г. працавалі 21 беларуская дзяржаўная, 44 польска-беларускія школы, 3 беларускія гімназіі (Віленская, Навагрудская, Клецкая). З 1929 г. выпускнікі Віленскай беларускай гімназіі атрымалі магчымасць паступаць у ВНУ Польшчы. На гуманітарным факультэце Віленскага універсітэта быў створаны лектарат беларускай мовы. З 1930 г. ў Вільні пачала працаваць беларуская настаўніцкая семінарыя імя Ф. Багушэвіча. Беларускія паслы дамагліся ад сейма субсідыі на патрэбы беларускай асветы ў суме 500 тыс. злотых: для настаўніцкіх курсаў, друкавання падручнікаў, дзейнасці Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (БІГіК), які знаходзіўся ў Вільні. У красавіку 1929 г. віленскі ваявода згадзіўся з утварэннем Беларускага настаўніцкага саюза. Мэтай гэтай арганізацыі была абарона прафесійных інтарэсаў беларускіх настаўнікаў, удасканаленне іх педагагічнага майстэрства, пашырэнне нацыянальнай культуры. Пазіцыя некаторых дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху, у прыватнасці Р. Астроўскага, А. Луцкевіча, адносна паразумення з польскімі ўладамі дзеля ажыўлення культурна-нацыянальнага жыцця дала пэўныя станоўчыя вынікі. Мела рацыю і іх імкненне да часовага аб’яднання на гэтай аснове ўсіх беларускіх арганізацый, якое праявілася ў стварэнні ў 1930 г. выбарчага блока «Цэнтрасаюз» (з 1932 г. Таварыства беларускай асветы). Але асноўная прычына, якая прымусіла «санацыйны» рэжым пайсці на ўступкі — «эфект Грамады». Менавіта папярэдні, найвышэйшы ў сваім развіцці перыяд заходнебеларускага руху прымусіў польскі ўрад зрабіць гэта. Аднак становішча беларускай школы фактычна не палепшылася. Уступкі з боку польскай дзяржавы на карысць беларускай асветы ў 1928 — 1930 гг. чаргаваліся з мерамі па яе ліквідацыі. У 1929 г. была закрыта Радашковіцкая гімназія. Падставамі паслужылі яе блізкае размяшчэнне каля мяжы з БССР, нізкі ўзровень адукацыі, непапулярнасць сярод беларускага насельніцтва. Апошняе сцвярджэнне было няпраўдай і абвяргаецца тым фактам, што ў гэты час у гімназіі вучылася

найбольшая за ўсю яе гісторыю колькасць вучняў — 240 чалавек. Ліквідацыя Радашковіцкай гімназіі часова аб'яднала ўсіх беларускіх паслоў у сейме, якія выказалі сумесны пратэст, аднак гэта не спыніла далейшага размежавання заходнебеларускага руху.

У 1929/30 навучальным годзе колькасць беларускіх і польска-беларускіх школ зменшылася да 26. У снежні 1929 г. на нарадзе кіраўнікоў усходніх ваяводстваў падкрэслівалася, што «імкненне беларусаў да нацыяналізацыі школы — небяспечнае». Перыяд частковых уступак з адначасовымі рэпрэсіямі канчаткова змяніўся ў 1930 г. мерамі па ліквідацыі беларускай асветы. На чарзе было закрыццё двухмоўных школ. Патрабаванні Галоўнай рады Цэнтрасаюза, якія яна сфармулявала ў наказах сваім кандыдатам на парламенцкіх выбарах 1930 г. — адмена закона аб мовах ад 31 ліпеня 1924 г., адкрыццё, згодна са складзенымі раней дэкларацыямі, беларускіх пачатковых школ, адпаведнай колькасці сярэдніх і прафесійных школ з выкладаннем па-беларуску, беларускага педінстытута пры Віленскім універсітэце, стварэнне для гэтага спецыяльнай школьнай адміністрацыі, — так і не былі рэалізаваны. У 1931 г. закрыта беларуская гімназія ў Клецку, вясной 1932 г. — настаўніцкая семінарыя імя Ф. Багушэвіча ў Вільні. Выкарыстоўваючы пагаршэнне матэрыяльнага становішча беларускага грамадства, улады ў сярэдзіне 1932 г. пераўтварылі апошнія дзве беларускія гімназіі (Віленскую і Навагрудскую) у філіялы польскіх дзяржаўных гімназій. У канцы 1920—сярэдзіне 30-х гадоў захаванню беларускай школы перашкаджаў палітычны экстрэмізм у дзейнасці КПЗБ, што выкарыстоўвалі польскія ўлады. Так, негатыўна ўплывалі на стан беларускіх гімназій арганізаваныя камуністамі забастоўкі вучняў. Усе яны заканчваліся, як правіла, масавымі выключэннямі школьнікаў ці нават закрыццём школ. Не заўсёды сярод вучняў былі пашыраны сімпатыі да КПЗБ. Асабліва дрэнна адбілася на развіцці гэтай кампаніі пасіўнасць значнай часткі вучняў гімназій да камуністычнай агітацыі. У 1932 г. ў Польшчы пачалася рэформа адукацыі, якая мела сваёй мэтай «усеагульнае навучанне» і выхаванне адданых польскай дзяржаве грамадзян. Увядзенне 3-ступеньчатай школьнай структуры абмежавала доступ да сярэдняй і вышэйшай адукацыі беларускаму, пераважна сялянскаму, насельніцтву. У пачатку 1938 г. у заходнебеларускіх землях з 3843 дзяржаўных пачатковых школ з польскай мовай выкладання школ 1-й ступені было 3131, 2-й — 434, 3-й — толькі 278. Не быў выкананы і лозунг «усеагульнага навучання». У 1936 г. на Палессі з 236 тыс. дзяцей школьнага ўзросту 53 тыс. не былі ахоплены навучаннем. Існуючыя ў Заходняй Беларусі польскія навучальныя ўстановы станавіліся асяродкамі пашырэння «польскасці». «Паглыбленне ўсведамлення вучнем найважнейшых з'яў дзяржаўнага, нацыянальнага і грамадскага жыцця пад агульным пунктам гледжання дзяржаўнага выхавання» было асноўнай іх функцыяй. Зменшыліся шансы атрымаць сярэднюю і вышэйшую адукацыю і ў сувязі з рэзкім павышэннем платы за навучанне. Калі да 1927 г. за вучобу ў ВНУ плацілі 50 злотых у год, то з 1932 г. ўступны ўзнос павялічыўся з 30 да 270 злотых, за навучанне на 2-м і 3-м курсах плацілі адпаведна 250 і 220 злотых, на наступных — па 200 злотых у год. У пачатку 1933 г. па гэтай прычыне пакінулі вучобу шмат студэнтаў. Віленскі універсітэт — адзіная ВНУ ва ўсходніх ваяводствах — ператварыўся ў цэнтр паланізацыі гэтага рэгіёна. У 1930—36 гг. доля беларусаў сярод студэнтаў універсітэта вагалася ад 1,6 да 2,8%. Доля палякаў вырасла з 63,2% у 1930/31 навучальным годзе да 72,6% у 1937/38 навучальным годзе. У міжваенны перыяд знач-

ная колькасць моладзі, асабліва выпускнікоў беларускіх гімназій, вымушана была нелегальна ехаць на вучобу за мяжу: у СССР, Чэхаславакію і іншыя еўрапейскія краіны. Атрымаць вышэйшую адукацыю ў Польшчы для выпускнікоў адзінай беларускай гімназіі ў Вільні было амаль немагчыма. Менавіта таму ў канцы 1930-х гадоў актуальнай стала праблема адкрыцця беларускага ліцэя ў Вільні. У чэрвені 1937 г. бацькоўскі камітэт гімназіі дамагаўся ад урада Польшчы адкрыцця беларускага ліцэя гуманітарнага тыпу. Таго ж патрабаваў у жніўні 1937 г. і Беларускі нацыянальны камітэт. Аднак і да верасня 1939 г. праблема не была вырашана. Напярэдадні 2-й сусветнай вайны беларуская школа як сістэма нацыянальных навучальных устаноў і грамадскіх арганізацый у Польшчы практычна ўжо не існавала. У канцы 1936 г. на Палессі не было наогул школ з няпольскай мовай навучання. У лютым 1937 г. палескі ваявода ў дакладзе МУС Польшчы наконт кадравай палітыкі ў галіне адукацыі адзначаў, што «не можа быць гутаркі, найменш на працягу 10 бліжэйшых гадоў, каб настаўнікам на Палессі мог быць рускі, украінец, беларус ці нават мясцовы паляшук...». У 1937/38 навучальным годзе намячалася канчатковая ліквідацыя беларускіх і літоўскіх школ, а замест іх — адкрыццё польскіх у Навагрудскім ваяводстве. Планавалася таксама поўнасцю вызваліць з настаўніцкіх пасад асоб няпольскай нацыянальнасці і замяніць іх выключна палякамі, прызначаць дырэктарамі школ былых польскіх вайскоўцаў, усё гэта прадугледжвалася для таго, каб «у бліжэйшыя 4 гады пачатковая школа была поўнасцю апанавана польскім прадзяржаўным, настроеным на асвету моладзі ў нацыянальна-польскім духу элементам»[1].

У 1937/38 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі дзейнічалі толькі 5 польска-беларускіх пачатковых школ, 1 беларуская гімназія, у 44 польскіх школах беларуская мова вывучалася як прадмет. Ліквідацыя беларускіх школ, пашырэнне сеткі польскіх не азначала фактычнага спынення руху за беларускую школу. У 1930-я гады ён трансфармаваўся ў культурна-асветніцкі, дзе галоўнае месца адводзілася самаадукацыі. Такі спосаб пазнання роднага слова з'яўляўся адзіна магчымым і найбольш дзейсным у самазахаванні беларускага насельніцтва ва ўмовах дзяржаўнай асіміляцыі. Настаўнік С. Паўловіч склаў і выдаў у 1936 г. ў Вільні буквар для хатняга навучання «Першыя занятківі». Урач С. Грынкевіч у канфіскаванай паліцыяй кнізе «Асвета» (Аб народным універсітэце і іншых спосабах асветнае працы; Вільня, 1936) прапанаваў цэлы шэраг мер па самаадукацыі. Азначаны рух меў шанс на развіццё пры больш спрыяльных унутрыпалітычных абставінах, бо з'яўляўся апазіцыйным да дзяржаўнай польскай школы. Аднак пасля забароны ў 1937 г. ТБШ і БІГіК магчымасці для пашырэння яго звузіліся. У 2-й палове 1930-х гадоў некаторыя польскія палітыкі прызнавалі шкодной сістэму абмежавання культурна-нацыянальнага жыцця беларусаў. Так, дэпутат В. Пэлчынская ў сваіх прамовах у сейме лічыла мэтазгодным стварыць умовы для легальнай дзейнасці беларускіх палітычных і грамадскіх інстытутаў. Практыка перашкод і ганенняў на беларусаў, як лічыла яна, была не на карысць польскай дзяржаве: у беларускага насельніцтва абуджалася пачуццё ўласнай сілы, грамадская актыўнасць пераходзіла ў нелегальныя формы работы. Аднак такія адзінкавыя выступленні ў сейме ў абарону беларусаў (іх прадстаўнікоў пасля 1935 г. там ужо не было), хоць і з прагматычных пазіцый польскай лібе-

---

[1] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці, ф. 1, воп. 10, спр. 1281, а. 40 адв.

ральнай буржуазіі, не ўнеслі карэктыў у нацыянальную палітыку Польшчы.

Такім чынам, у становішчы заходнебеларускай школы варта вылучыць 2 асноўныя перыяды: да канца 1920-х і 1930-я гады. Хоць ужо ў 1920-я гады ў Польшчы ішоў працэс ліквідацыі беларускай школы, аднак існаваў значны фактар супрацьдзеяння яму ў форме руху за нацыянальную школу. У 1922 — 1924 гг. гэта найбольш яскрава выявілася ў дзейнасці беларускіх парламентарыяў, у 1925—1927 гг. — у межах самага масавага сялянскага руху ў міжваеннай Польшчы пад кіраўніцтвам Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Станоўчыя вынікі апошняга беларуская школа адчула толькі пасля разгрому грамады (1927). Рух за нацыянальную школу прымусіў польскія ўлады змяніць акцэнты ў школьнай палітыцы на карысць больш павольнага тэмпу паланізацыі адукацыі — павелічэнне колькасці двухмоўных школ, якія затым станавіліся польскімі. Частковае задавальненне патрэб беларусаў у галіне асветы ў 1928—1930 гг., якое разглядалася «санацыйным» рэжымам як адна з мер барацьбы з радыкальна-камуністычным рухам, з 1930 г. канчаткова змянілася курсам на далейшую ліквідацыю іх нацыянальнай школы. Садзейнічаў таму і знешні фактар — змена нацыянальнай палітыкі ў БССР, разгортванне там рэпрэсій супраць беларускай інтэлігенцыі, якую беспадстаўна абвінавачвалі ў т. зв. нацдэмаўшчыне. У 1930-я гады рух за нацыянальную школу на заходнебеларускіх землях набыў культурна-асветніцкі характар. Аднак ліквідацыя польскімі ўладамі беларускіх навучальных устаноў, палітычных і грамадскіх арганізацый аслабляла яго. Адмоўна ўплывала і нешматлікасць, палітычная разрозненасць заходнебеларускай інтэлігенцыі. У канцы 1930-х гадоў беларуская школа ў Заходняй Беларусі ўжо фактычна не існавала, што з'явілася вынікам мэтанакіраванай палітыкі Польшчы на асіміляцыю яе насельніцтва. Аднак перабольшваць памеры дэнацыяналізацыі беларускага насельніцтва нельга. Нягледзячы на ліквідацыю і закрыццё нацыянальных школ, культурна-асветніцкіх таварыстваў, імкненне беларусаў да набыцця ведаў на роднай мове праз даступныя сродкі (самаадукацыю, розныя віды пазашкольнай дзейнасці, асветную і мастацкую працу) павялічвалася. Рэалізаваць жаданне мець нацыянальныя школы было магчыма толькі пасля ліквідацыі дзяржаўных меж, якія раздзялялі адзіны беларускі народ і перашкаджалі яго далейшай кансалідацыі.